74.58
И.29

# ИДЕОЛОГИЧЕСКАЯ РАБОТА И МЕРЫ ПО ЕЕ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЮ

Тезисы докладов межвузовской преподавательско-студенческой научной конференции

УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ БАНКОВСКИЙ КОЛЛЕДЖ
НАЦИОНАЛЬНОГО БАНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»

«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭКОНОМИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ИДЕОЛОГИЧЕСКАЯ РАБОТА И МЕРЫ ПО ЕЁ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЮ

Тезисы докладов
межвузовской преподавательско-студенческой
научной конференции

Пинск, 25 мая 2006 г.

Пинск 2006

УДК 37+32+36(06)
ББК 74.58 + 66.0
Т 29 Тезисы докладов межвузовской преподавательско-студенческой научной конференции
И 29 Идеологическая работа и меры по её совершенствованию

Материалы печатаются в основном в том виде, в котором они были представлены авторами. Только в некоторых случаях они сокращены или подредактированы - там, где это было особенно необходимо.

Материалы печатаются по решению кафедры социально-гуманитарных дисциплин. Протокол. № 9 от 21.04.2006г.

*Ответственный за выпуск* **М.В. Цуба**

**Идеологическая** работа и меры по её совершенствованию: Тез: докл. межвуз. препод.-студен. научн. конф. Пинск, 25 мая 2006 г. 144 с.

СОДЕРЖАНИЕ

*Татаревич Валентина Федоровна* Идеологическое сопровождение воспитательной работы 5

*Макарушко Владимир Владимирович* Идеологическая работа и меры по ее совершенствованию 13

*Боричевская Валентина Васильевна* Информационная безопасность в сфере идеологической работы 17

*Игнатюк Елена Александровна* Эстетическая потребность: красота «формы» 20

*Можейко Павел Павлович* Христианство в современном мире 29

*Григорик Виктория Александровна* Конфессиональное состояние в г. Пинске (православие, католицизм) 37

*Гордич Анна Александровна* Конфессиональное состояние в г. Пинске (иудаизм, протестантизм) 42

*Ясинский С.А.* Спорт и идеология 46

*Фядзечка Сяргей Аляксеевіч* Фарміраванне ідэалогіі адносін да нацыянальных меншасцяў у II Рэчы Паспалітай 51

*Мисюковец Любовь Петровна* Социокультурная среда ВУЗа и её влияние на формирование личности студента 58

*Левченко А.Н.* Экономика и идеология 64

*Цуба Міхаіл Віктаравіч* Пачатак Першай сусветнай вайны і фарміраванне ідэалагічнай думкі на прыфрантавой паласе 69

*Гичун Д.И.* Партизанское движение в Беларуси. 86

*Шчэрба Галіна Аляксандраўна* Расійскі фактар і станаўленне беларускай дзяржаўнасці ў 20-я гады XX ст. 91

*Гагуа Руслан Борисович* Грюнвальдская битва в воспитании патриотизма при преподавании истории 99

*Грицкевич Татьяна Евгеньевна Шайковская Ольга Николаевна* Роль истории Отечества в формировании гражданской позиции современной молодежи 102

*Ковшик Татьяна Константиновна* Идеология как фактор развития белорусского общества на современном этапе 106

*Никитина Елена Васильевна* Идеология как основа формирования мировоззрения и гражданской позиции личности 111

*Евстафьев В.А.* Об эффективности идеологического влияния на молодежь 117

*Дмитриев Денис Андреевич* Идеология и проблемы молодежи 122

*Жилинский Павел Аркадьевич* Направление идейно-воспитательной работы в учебном заведении 126

*Петрушкевич Ольга Евгеньевна* Идеологическая работа в учреждениях образования 132

*Казакевіч Аляксандр Анатольевіч* Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў пачатку XIX ст. 135

# ФАРМІРАВАННЕ ІДЭАЛОГІІ АДНОСІН ДА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЯЎ У ІІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

*С.А. Фядзечка*

*(ПФ БГЭУ)*

Адносна нацыянальнай палітыкі яшчэ перад адраджэннем Польшчы вылучыліся дзве канцэпцыі. Першая, найлепей сфармуляваная нацыянальна-дэмакратычным рухам, была развіццём формулы, якая агалошвала перавагу нацыянальных інтарэсаў у адносінах да дзяржавы і грамадства, а таксама прызнавала натуральнасць нацыянальных канфліктаў [1, с. 621]. Адпаведна гэтай канцэпцыі ролю гаранта стабільнасці і незалежнасці польскай дзяржавы павінен быў выконваць польскі народ як валодаючы значнай перавагай у гаспадарчым жыцці і культурным развіцці перад астатнімі. Іншыя народнасці павінны былі падпарадкавацца гэтай палітычнай, эканамічнай і культурнай перавазе палякаў. Такая праграма адмаўляла непольскім жыхарам дзяржавы права на свабоднае нацыянальнае жыццё, робячы з іх грамадзян ніжэйшай катэгорыі. Канкрэтна гэта прыводзіла да паланізацыі беларусаў і ўкраінцаў [2, с. 303], ізаляцыі яўрэяў ад грамадскага жыцця і аслаблення гаспадарчай і палітычнай пазіцыі немцаў, з перспектывай паланізацыі занятых імі тэрыторый. Выразам гэтай дактрыны была тэрытарыяльная праграма Нацыянальнай Дэмакратыі, вядомая пад назвай інкарпарацыйнай [3, с. 320].

У апазіцыі да нацыяналістычнай думкі заставаліся прапагандуючыя вырашэнне нацыянальнага пытання праз талерантнасць і суіснаванне. Яны зыходзілі з таго, што механізмы стварэння І Рэчы Паспалітай змогуць дапамагчы стварыць новую, другую, Рэч Паспалітую ўжо ў федэратыўнай форме [4, с. 23]. Пры гэтым уступленне ў федэрацыю павінна быць

добраахвотным, а сам федэратыўны тып дзяржавы прывядзе да дэмакратызацыі ўнутраных стасункаў і гарантаванага прызнання праў усіх народнасцяў.

Тыповай праявай такога становішча былі спрэчкі ў польскай дэлегацыі перад парыжскім кангрэсам. Польскія нацыянал-дэмакраты на чале з Р. Дмоўскім выступалі за стварэнне моцнай дзяржавы паміж Германіяй і Расіяй. З гэтай нагоды Дмоўскі лічыў, што "федэрацыя—гэта слабасць, а не сіла, таму што ўласна няма з кім ствараць федэрацыю". Такім чынам, праблема нацыянальных меншасцей паўставала перад новай польскай дзяржавай у двух сваіх праявах, якія можна назваць геапалітычнымі:

- праблема славянскіх меншасцей і Літвы.

- праблема нямецкай меншасці на землях, якія адышлі па версальскіх дамоўленасцях да Польшчы.

Яшчэ адной праявай міжнацыянальных адносін з'яўлялася палітыка да яўрэйскай меншасці.

Змены, якія прынесла Кастрычніцкая рэвалюцыя не падцвердзілі спадзяванняў, па якіх менавіта Польшчы належала б роля вызваліцеля суседніх (з усходу) народаў. Рыжскае мірнае пагадненне азначала перамогу тэрытарыяльнай праграмы Нацыянальнай Дэмакратыі. Гэта прымушала прыхільнікаў праграмы да далейшага развіцця нацыянальнай канцэпцыі. Тым часам выбары ў сейм і прэзідэнцкія выбары 1922 года, а таксама развіццё сітуацыі ў Галіцыі і на Заходняй Беларусі паставілі пад знак пытання правільнасць лозунга "Польшча для палякаў". Насуперак разважлівасці і паслядоўнасці гэта прывяло да абвастрэння нацыяналізму эндэкаў [5, с. 835].

Р. Рыбарскі, разважаючы пра сутнасць нацыянальнай палітыкі ў зноў створаных дзяржавах, даводзіў:—"нацыянальная дзяржава не адзначае таго, што нацыянальныя меншасці не маюць ніякіх праў, што іх мова па-за законам, што ім нельга мець уласныя школы і г. д. Але толькі ў тым разе яна нацыянальная, калі дамінуючы народ праводзіць дзяржаўную палітыку, калі большасць надае нацыянальным інстытутам свой характар, калі на яго

тэрыторыі не можа адбыцца нічога такога, што процістаяла б яго ўяўленню аб нацыянальнай карыснасці, што фактычна даказвала што гэты народ не гаспадар у сваёй краіне” [6, с. 240].

Нацыянальны характар дзяржавы на практыцы адзначаў, што адзінай дзяржаўнай мовай магла быць толькі польская, і гэта ў сваю чаргу выклікала адсутнасць магчымасці атрымаць нейкую значную адукацыю не на польскай мове. Нацыянальныя меншасці мелі магчымасць стварэння адукацыйных устаноў ці гаспадарча-культурных суполак толькі за ўласны кошт. Дзяржаўная палітыка, не карыстаючыся прымусам, павінна выклікаць сярод нацыянальных меншасцей перакананне, што толькі поўная лаяльнасць дае гарантыі грамадскага раўнапраўя [7, с. 49]. Беларусы і ўкраінцы як народы без “выразнай нацыянальнай пазіцыі”, трактаваліся як патэнцыйная мэта асіміляцыі праз натуральны ўплыў польскай культуры (тым не менш, эндэкі адзначалі тэндэнцыі самаізаляцыі польскага насельніцтва на Ўсходніх Крэсах) [8, с. 51] і змену нацыянальнай структуры Ўсходняй Галіцыі і паўночна-усходніх крэсаў. Частка нямецкага і яўрэйскага насельніцтва, што пасялілася на тэрыторыі краіны пад уздзеяннем выпадковых прычын, павінна, згодна публіцыстаў народных дэмакратаў, у хуткім часе пакінуць краіну. А тым часам павінна адбывацца ізаляванне гэтых народнасцяў ад грамадства і праходзіць барацьба з іх гаспадарчым уплывам. Галоўны акцэнт народныя дэмакраты рабілі на яўрэйскую праблему: былі прапанаваны тэзісы ачышчэння прамысловасці і гандлю і абмежавання доступу яўрэяў да вышэйшай школы [9, с. 835 ].

Галоўныя публіцысты пілсудчыкаў разглядвалі нацыянальную палітыку ў цеснай сувязі з міжнароднымі праблемамі. Падтрымліваючы пастулат аб незалежнасці Ўкраіны і Беларусі адначасова яны лічылі вырашаным пытанне аб інтэграцыі паўночна-ўсходніх крэсаў і Галіцыі з польскай дзяржавай. Незалежнасць Украіны і Беларусі, трактавалася як праграма, не маючая шансаў для рэалізацыі. Існуючая польская палітыка павінна была перашкаджаць насельніцтву Крэсаў у яго імкненні да Савецкага

Саюза і адначасова стварыць цесныя сувязі з ІІ Рэччу Паспалітай, каб нават узнікненне ўкраінскай ці беларускай дзяржаў не змяніла ўсходніх межаў Польшчы [10, с. 58]. Такое супрацоўніцтва павінна развівацца праз стварэнне для меншасцей спрыяльных умоў развіцця, як гаспадарчага , так і нацыянальнага, і стварэнне сярод іх пераканання ў неабходнасці трывалай сувязі з польскай дзяржавай ці пераарыентаванне ўкраінскага нацыяналізму ва Ўсходняй Галіцыі з антыпольскага ў антырасійскі (вяртанне яго да ідэі "вялікай Украіны")

Далей за ўсё развіліся ідэі надання аўтаноміі, сфармуляваныя на пачатку дваццатых гадоў [11, с. 23]. Шырокую тэрытарыяльную аўтаномію павінны былі атрымаць (акрамя Шлёнска) Усходняя Галіцыя і Віленшчына, а разам з тым паўночна-ўсходнія крэсы атрымоўвалі магчымасць ваяводскага самакіравання. Існаваў нават праект М. Недзялкоўскага (накіраваны, праўда, на Ўсходнюю Галіцыю), які прапаноўваў стварэнне Сейму і мясцовага ўрада, якія б у сваю кампетэнцыю ўключалі пытанні адукацыі, рэлігіі, сельскай гаспадаркі, прамысловасці і гандлю, абароны працы, сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя і мясцовага самакіравання. Для паўночна-усходніх крэсаў прапаноўвалася самастойнасць толькі ў пытаннях адукацыі, сацыяльнай абароны і мясцовага самакіравання [12, с. 38].

Гэтую праграму, прадыктаваную тактычнымі пабуджэннямі (набліжаліся выбары 1922 года), з часам змяніла другая, больш паслядоўная. Тэрытарыяльная аўтаномія ўжо трактавалася як лозунг, які быў здольны вырашыць толькі культурныя пытанні [13, с. 8], а галоўны націск рабіўся на вырашэнне бягучых праблем: рэформ кіравання і асветы, правядзенне асэнсаванай гаспадарчай палітыкі. На практыцы гэта павінна было адбіцца на моўным раўнапраўі ў адукацыі і адміністратыўных справах, правядзенні на ўсходніх тэрыторыях зямельнай рэформы, пашырэннем інвестыцый, будаўніцтве камунікацый [14, с. 185].

Вышэй выказаныя думкі пілсудчыкаў увайшлі з пэўнымі зменамі ў праграму 1926 года. Міжнародны аспект праблемы толькі нязначна

паўплываў на яе сутнасць. Адмаўляючыся ад нацыяналістычнага напрамку нацыянальнай асіміляцыі, пілсудчыкі прыйшлі да ідэі дзяржаўнай асіміляцыі: дзяржава стварае нацыянальным меншасцям умовы неабмежаванага развіцця нацыянальнай культуры і клапоціцца аб эканамічным становішчы, распаўсюджваючы пачуццё адказнасці за лёс краіны ці хаця б лаяльнасць [15, с. 730].

Вышэйшая праграма дзяржаўнай асіміляцыі не прадстаўляла манаполіі пілсудчыкаў. Яна знайшла праціўнікаў сярод ліберальнай інтэлігенцыі, іншых слаёў насельніцтва [16, с. 283]. Адмаўляючы рамантычнаму ірацыяналізму пілсудчыкаў яны засцерагалі ад небяспечнасці, якую несла грамадскаму міру рэалізацыя канцэпцыі Нацыянальнай Дэмакратыі. Найвядомейшымі з іх былі Ян Бадуін Дэ Куртэно[1] [17], К. Срокаўскі[2] [18].

У справе найбольшага забеспячэння правоў нацыянальных меншасцей істотна далей пайшла *Польская Сацыялістычная Партыя (ППС). Сацыялісты* канцэнтравалі сваю ўвагу на праблемах славянскіх меншасцей, што было адказам на падзеі ў Польшчы на працягу 1922-1924 гг.. Акрамя вышэй узгаданых поглядаў Галуўкі, у партыі існавала яшчэ тры канцэпцыі. Недзялкоўскі прапагандаваў наданне ўкраінскім землям тэрытарыяльнай аўтаноміі а беларускім—шырокага самакіравання. Зігмунд Зулаўскі прапаноўваў аб'яднанне Усходняй Галіцыі з Валынню (за выключэннем Львова, Барыслава і Драгобыча) у адну аўтаномію. Узгадненне гэтых пазіцый адбылося на Вышэйшай Радзе ў верасні 1924 года, якая прапанавала стварыць

---

[1] **Бадуін дэ Куртэно Ян** (BAUDOUIN DE COURTENAY JAN NIECISŁAW ці Іван Александравіч Бадуін дэ Куртэно, 1845–1929), рускі і польскі мовазнаўца французскага паходжання; прафесар універсітэтаў у Казані (1875), Кракаве (1894–98), Пецярбурзе, Варшаве (з 1918); стваральнік казанскай мовазнаўчай школы, з 1897 член Пецярбургскай АН; выдавец „Prac Filologicznych", заснавальнік (1925) Польскага мовазнаўчага таварыства; абаронца правоў нацыянальных меншасцяў, у 1922 прапанаваны ад іх на пасаду прэзідэнта Польшчы. Асабістыя працы па тэорыі мовы, гісторыі і дыялекталогіі славянскіх моў, параўнаўчага мовазнаўства, між іншымі: *O driewnie-polskom jazykie do XIV stoletija* (1870), *Opyt fonietiki riezjanskich goworow* (1875), *O ogólnych przyczynach zmian językowych* (1891), *Próba teorii alternacji fonetycznych* (1894), *Zarys historii języka polskiego* (1922).

[2] **Срокаўскі Канстанты** (SROKOWSKI KONSTANTY, 1878–1935), публіцыст, палітык; адзін з кіраўнікоў Польскага дэмакратычнага аб'яднання ў Галіцыі; рэдактаваў: 1899–1903 "Польскае Слова" („Słowa Polskiego"), 1906–28 "Новую Рэформу" („Nowej Reformy") і з 1928 "Ілюстраваны штодзённы кур'ер" („Ilustrowanego Kuriera Codziennego"); працы: *Upadek imperializmu Austrii...* (1913), *Zarys historii Naczelnego Komitetu Narodowego* (1923).

на беларускіх і ўкраінскіх землях аўтаноміі, загадваючы клубу парламентарыяў унесці адпаведны праект у Сейм [19, с. 51—54]. Гэта акрэсліла праграму партыі на бліжэйшыя гады, хаця пасля майскага перавароту пастулаты аўтаноміі пачалі трактавацца як прапагандысцкія лозунгі (як пратэст супраць нацыянальнай палітыкі паслямайскіх урадаў), і сам праект быў прадстаўлены ў Сейме толькі ў 1931 годзе.

Погляды левых на нацыянальную праблему фарміраваліся пад непасрэдным уплывам ленінскага лозунга аб самавызначэнні народаў. У пастанаўленні II З'езду Камуністычнай Партыі Рэчы Паспалітай (КПРП) "За нашу і вашу волю!" адкінуты любыя праявы нацыянальнага ціску, прапагандуецца барацьба беларускага і ўкраінскага народаў "да вызвалення з пад польскай буржуазна-капіталістычнай улады і аб'яднання з БССР і ЎССР". У адносінах да немцаў і яўрэяў прапанаваны пастулат "поўнай свабоды культурнага развіцця і фактычнага раўнапраўя палітычнага і грамадзянскага гэтых народаў".

Рэалізацыя гэтых пастулатаў павінна была адбыцца праз "знішчэнне ўлады памешчыкаў і капіталістаў у Польшчы" адзіным пралетарыятам усіх народаў [20, с. 573, 575, 576]. Пашырэннем гэтага становішча былі пастанаўленні III З'езда КПП (сакавік 1925 г.). У прынятай там пастанове прызнаецца "права на самавызначэнне любых прыгнечаных народаў, нават да іх аддзялення ад польскай дзяржавы". Праграма ППС крытыкавалася як байка "аб магчымасці вырашэння нацыянальнага пытання ў буржуазнай Польшчы праз аўтаномію, федэрацыю, раўнапраўе і г. д." [21, с. 171]. Але, зразумела, што падобная пазіцыя польскіх камуністаў была прадыктавана перш за ўсё пастулатамі сусветнай пралетарскай рэвалюцыі і не мела адносін да праблем пабудовы польскай дзяржавы.

Літаратура:

1. Wapiński R., Z dziejow tendencji nacjonalistycznych. O stanowisku Narodowej Demokracji wobec kwestii narodowej w latach 1893-1939, „Kwartalnik Historyczny" 1973, nr 4

2. Tymieniecka A., Polityka Polskiej Partii Socjalistycznej w latach 1924—1928, Warszawa 1969

3. Тамсама, с. 320.

4. Grunberg K., Polskie koncepcje federalistyczne 1864—1918, Warszawa 1971.

5. Wapiński R. Указ. сач.

6. Rybarski R.. Narod, jednostka, klasa, Warszawa 1926

7. Grabski S., Z codziennych walk i rozważan, Poznań 1923, с. 49.

8. Тамсама, с. 51.

9. Wapiński R. Указ. сач., с. 835.

10. Hołówko T., Minimalny program polityki polskiej we Wschodniej Galicji i na tzw. "Kresach", "Droga" 1924

11. Bukowiecki S., Polityka Polski Niepodległej. Szkic programu, Warszawa, 1922.

12. Hołówko T. Указ. сач., с. 38.

13. Pszczółkowski M [L. Wasilewski], Polska dla Polaków czy Polska dla wszystkich obywateli? Sprawa mniejszości narodowych w Polsce, Warszawa,1924.

14. Sujkowski A., Dodatek do „Polski Niepodleglej", Warszawa, 1926.

15. Nałęcz D., „Droga" jako platforma kształtowania się ideologii piłsudczyków, „Przegląd Historyczny" ,1975, z. 4

16. Bobrzyński Michał, Wskrzeszenie państwa polskiego t. II: 1918—1923, Kraków ,1923.

17. Baudouin de Courtenay J., Kwestia żydowska w Państwie Polskim, Warszawa 1923

18. Srokowski K., Sprawa narodowościowa na Kresach Wschodnich [recenzja], „Droga" 1924, nr 5, s. 67-68

19. Tymieniecka A., Polityka Polskiej Partii Socjalistycznej w latach 1924—1928, Warszawa 1969

20. II Zjazd Komunistycznej Partii Robotniczej Polski, Warszawa 1968

21. KPP. Uchwały i rezolucje t. 1, Warszawa 1953